Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# МЕТАДЫ АРГАНІЧНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА

**Труціць сад хіміяй неабавязкова — ёсць куды больш эфектыўныя спосабы аднавіць прыродны баланс. Гэта адпужванне, маскіроўка, адцягненне і прыцягненне.**

## Адпужванне

Многія насякомыя-шкоднікі не пераносяць рэзкія пахі піжмы, палыну, тагецесаў (аксамітак), календулы і іншых. Пасадзіце расліны-абаронцы ў стратэгічна важных месцах: вакол ягадных кустоў або па перыметры агарода. Выкарыстоўвайце падручныя сродкі: так, расаду капусты пасля перасадкі ў адкрыты грунт можна прысыпаць драўняным попелам — гэта саб'е з панталыку крыжакветных блошак і адначасова ўгноіць глебу.

## Маскіроўка

Паспрабуйце сумешчаныя і ўшчыльненыя пасадкі. Пасадзіўшы расліны ўразнабой, перамяжоўваючы і чаргуючы іх адну з адной, можна тым самым замаскіраваць асабліва «смачныя» для шкоднікаў віды. Яны іх напросту не знойдуць.

Вядома, гэты прыём у першую чаргу эфектыўны для агарода, але і ў кветніках, і ў пладова-ягадным садзе таксама можа дапамагчы. Напрыклад, два рады парэчак, падзеленыя малінай, будуць у большай захаванасці, чым без падобнага падзелу. І наадварот: навала касачоў і лілей у межах аднаго кветніка можа прывесці да масавага паражэння трыпсамі і іншымі паразітамі. Памятайце пра гэта, ствараючы калекцыі.

## Адцягненне

Яшчэ адзін прыём захавання каштоўных відаў раслін ад шкоднікаў — гэта адцягненне. Пакіньце дзе-небудзь у кутку сада, але далёка ад кветніка або агарода крыху шматгадовага пустазелля. На кожным участку гэта будуць свае віды, але, напэўна, вы заўважалі, што чартапалох або рамонак лекавы ўсе абсыпаныя тлёй, а на квітнеючы куст хрэну збіраюцца розныя вусені. У такім суседстве вашым садовым раслінам ні-



чога не пагражае — яны менш смачныя для насякомых.

***Парада:** З аднаго пустазелля шкоднікаў лягчэй сабраць. І, што важна, не шкада знішчыць разам з раслінай.*

## Прыцягненне пчол і чмялёў

Змагацца са шкоднікамі мала — тэорыя арганічнага земляробства кажа пра тое, што аднолькава важна прыцягваць у сад «прыродных ворагаў». Драпежнікі з'яўляюцца ў садзе самі, а вось пчол і чмялёў варта запабліваць спецыяльна. Для гэтага абавязкова высаджвайце расліны-меданосы з такім разлікам, каб яны цвілі бесперапынна, змяняючы адна адну.

Увесну гэта будуць пралескі, крокусы, вярба, дэкаратыўныя цыбулі, мядунка, бэз. Цвіценне бружмелі, каліны, парэчак, вішні, яблыні таксама напоўніць сад гудзеннем пчол.

У пачатку лета — аквілегія, дэльфініум, барага (агурочная трава), званочак, кацiная мята, кізільнік, герань, мардоўнік, ільвіны зеў, духмяны гарошак, чабор.

У канцы лета — касмея, эхінацэя, настурка, расходнік пурпурны, цыкорыя, фацэлія.

***Парада:** Расліны лепш высаджваць на сонца групамі, каб апыляльнікам лягчэй было іх знайсці.*

***Парада:** Стварыце ўмовы для жыцця. Неабавязкова будаваць спецыяльныя домікі для тых, хто прыляцеў да вас у сад, — тым больш што мы не заўсёды можам адгадаць патрэбы нашых сяброў. Дастаткова пакінуць у якім-небудзь кутку саду купку будаўнічага смецця з шыферу і цэглы.*

Вожыкі любяць галінкі — складзіце за адрынай каля плота ламачча; адна пара вожыкаў цалкам пазбавіць ваш сад ад смаўжоў.

Выдатна, калі на ўчастку ёсць сажалка з воднымі раслінамі, у ёй абавязкова з'явяцца жабы.

Пры пакосе пакідайце некранутым кавалачак саду дзе-небудзь у гушчы кустоў і не на прахадным месцы, каб дробным звяркам было дзе схавацца.

***Важна:** Выкарыстоўваць ці не ў сваім садзе хімічныя прэпараты для барацьбы з шкоднікамі і пустазеллем — вырашаць вам. Але нават калі вы не гатовыя ад іх цалкам адмовіцца, абавязкова прытрымлівайцеся дазволеных тэрмінаў апырсквання і не распыляйце іх у перыяд масавага цвіцення раслін, каб як мага менш нашкодзіць насякомым-апыляльнікам.*

## ЗНІШЧАЕМ ПУСТАЗЕЛЛЕ

Каб знішчыць пустазелле без гербіцыдаў, выкарыстоўвайце соль і воцат. Прыгатуйце раствор: 3,8 літра воцату, 1/2 шклянкі солі, некалькі кропель любога вадкага мыйнага сродку (каб кроплі раствору прыліпалі да пустазелля). Добра змяшайце. Найбольш эфектыўна гэтая сумесь працуе ў спякотны, сонечны дзень, калі дажджу не чакаецца па меншай меры на працягу 24 гадзін.

Апырскайце пустазелле раніцай, вечарам вы ўжо пацешыцеся выніку.

Гэтая сумесь забівае ўсе расліны, якія ўступаюць з ёй у кантакт, так што выкарыстоўвайце з асцярожнасцю. Яшчэ яна вымывае з глебы пажыўныя рэчывы, таму лепш выкарыстоўваць яе для такіх месцаў, як пад'язныя шляхі, унутраныя панадворкі, дарожкі і г.д., там, дзе няма культурных пасадак.

Выкарыстоўвайце для апрацоўкі пустазелля 15—20-працэнтны воцат. Калі браць 5-працэнтны, то можа спатрэбіцца паўторная апрацоўка.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.25 | 21.06 | 15.41 |
| Віцебск — | 5.09 | 21.01 | 15.52 |
| Магілёў — | 5.17 | 20.56 | 15.39 |
| Гомель — | 5.18 | 20.46 | 15.28 |
| Гродна — | 5.41 | 21.20 | 15.39 |
| Брэст — | 5.48 | 21.14 | 15.26 |

## Месяц

*Поўня 7 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.** Абрама, Аляксандра, Апанаса, Георгія, Івана, Кузьмы, Сяргея, Фёдара, Ціхана.*
***К.** Карыны, Марыі, Густава, Сцяпана.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 2 ЖНІЎНЯ

**1542** год — іспанскі канкістадор Францыска дэ Арэльяна пасля 172-дзённага плавання ўніз па Амазонцы дасягнуў Атлантычнага акіяна, стаўшы першым чалавекам, які перасек Паўднёвую Амерыку ад акіяна да акіяна ў самай шырокай яе частцы, і першаадкрывальнікам найбуйнейшай ракі ў свеце.

**1810** год — дата нараджэння Дзмітрыя Пятровіча Жураўскага, эканаміста, статыстыка. У 1829 годзе скончыў Пецярбургскі кадэцкі корпус. З 1831-га працаваў у камісіі М. Сперанскага па складанні збору законаў Расійскай імперыі. Стварыў сістэму статыстычных паказальнікаў і метадаў вывучэння з'яў грамадства і прыроды, склаў праграму вывучэння вытворчых сіл Расіі. У пытаннях палітэканоміі набліжаўся да паняцця тэорыі працоўнай і дабаўленай вартасці. Прычыну ўсіх бедстваў народа бачыў у існуючых вытворчых адносінах, у размеркаванні прыватнай уласнасці па класах, адкуль вынікала, што галоўным тормазам развіцця прадукцыйных сіл Расіі з'яўляецца прыгоннае права. Асноўнае прызначэнне ўсёй эканамічнай навукі бачыў у забеспячэнні росту народнага дабрабыту. Прагрэсіўныя палітэканамічныя ідэі Жураўскага абумовілі правільны метадалагічны падыход да статыстычных даследаванняў, а яго статыстычныя працы аказалі вялікі ўплыў на ўсё далейшае развіццё эканамічнай навукі ў Расіі. Памёр у 1856 годзе.

**1840** год — выйшаў указ расійскага імператара Мікалая І аб спыненні дзейнасці на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года.

**1918** год — Савет Народных Камісараў СССР прыняў дэкрэт аб правілах прыёму ў вышэйшую навучальную ўстанову РСФСР, у адпаведнасці з якім адмянялася спагнанне платы за навучанне.

**1930** год — падчас доследна-паказальных вучэнняў Ваенна-паветраных сіл Маскоўскай ваеннай акругі на ўскраіне горада Варонежа ўпершыню ў СССР былі высаджаны паветраны баявы дэсант. Ідэі аб магчымасці перамяшчэння воінскіх падраздзяленняў па паветры з'явіліся разам з зараджэннем баявой авіяцыі. Але першапачаткова гаворка ішла толькі пра «пасадачны дэсант» (г. зн. байцоў і тэхніку павінны былі самалётамі дастаўляць у тыл праціўніка і там выгружаць), пра ўжыванне парашутаў для высадкі байцоў тады нізто яшчэ не думаў. Парашут разглядаўся выключна як сродак выратавання пілотаў і мала прыцягваў увагу ваенных спецыялістаў. Усё змянілася ў 1928 годзе, калі на нарадзе кіруючага складу ВПС было пастаўлена пытанне аб выкарыстанні парашутаў у ваеннай авіяцыі. Галоўная роля ў арганізацыі першага парашутнага дэсанта па праве належыць ваеннаму лётчыку Л. Р. Мінаву, які стаў фактычна першым ваенным парашутыстам у СССР. У 1929 годзе ён быў камандзіраваны ў ЗША, дзе пазнаёміўся са станам парашутнай справы, вывучыў методыкі падрыхтоўкі амерыканскіх лётчыкаў да вымушанага скачка з парашутам. Вярнуўшыся з дыпломам парашутыста і маючы вопыт трох скачкоў, ён стаў і першым інструктарам. Камандаванне ВПС паставіла Мінаву задачу правесці дэманстрацыйныя скачкі з парашутам. Гэтае заданне і паклала практычны пачатак паветрана-дэсантнай справе ў нашай краіне.



Было сказана

**Габрыэль Гарсія МАРКЕС, калумбійскі пісьменнік, публіцыст:**

*«Няма лякарства, здольнага вылечыць тое, што можа вылечыць шчасце».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Зрабіў справу — перарабі, але без працы не сядзі!**

— Дзяўчынка, а ты ведаеш, што цукеркі есці шкодна? Станеш тоўстай, зубы жоўтыя будуць.

— А мой дзядуля пражыў да 106 гадоў! І ўсе зубы былі ў парадку!

— Што, ён кожны дзень еў цукеркі?

— Не, ён не лез не ў сваю справу!

**Імяніннік так моцна дзьмуў на торт, што на наступную раніцу стрыптызёрка прачнулася з насмаркам.**

У клініцы.

— Зразумейце, дарагая, эратычныя сны вашага мужа не з'яўляюцца здрадай.

— Ды я не пра гэта, доктар. Як бы мне хоць адным вокам пагледзець, да якой бабы ён там ходзіць?..

**«Сядзі і не квакай!» — так часам Іван-царэвіч нагадваў сваёй жонцы пра яе мінулае.**

— А вось у мяне ёсць зямля ў даволі прыстойным раёне Мінска!

— Ну ты круты! І шмат?

— Не мала — пятнаццаць вазонаў!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2925.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 жніўня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12